# АЙКОНІМЫ АДАНТРАПАНІМНАГА ПАХОДЖАННЯ (НА МАТЭРЫЯЛЕ НАЗВАЎ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ ЛЕПЕЛЬШЧЫНЫ)

*Д.Г.Марчанка (Віцебск, ВДУ)*

Работа прысвечана аналізу айконімаў Лепельшчыны, утвораным ад антрапонімаў. Мэта даследавання – вызначыць асноўныя лексіка-семантычныя асаблівасці адыменных назваў населеных пунктаў, прасачыць пашыранасць ужывання розных тапафармантаў падчас утварэння айконімаў. Навуковая навізна даклада заключаецца ў тым, што ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве аб’ектам спецыяльнага даследавання сталі антрапаайконімы Лепельскага раёна.

**Ключавыя словы:** *айканімія; айконім; антрапаайконім; антрапонім; тапафармант.*

# ICONYMS OF ANTHROPONYMOUS ORIGIN (BASED ON THE NAMES OF SETTLEMENT POINTS IN THE LEPEL REGION)

*D.G.Marchanka (Vitebsk, VSU)*

The work is devoted to the analysis of the Lepel region's icononyms formed from anthroponyms. The aim of the study is to determine the main lexical and semantic features of the proper names of settlements, to trace the prevalence of the use of various topoformants during the formation of icononyms. The scientific novelty of the report lies in the fact that for the first time in Belarusian linguistics, the anthropoicononyms of the Lepel region have become the object of a special study.

**Key words:** *icononymy; icononym; anthropoicononym; anthroponym; topoformant.*

Айканімная сістэма Лепельшчыны характарызуецца вялікай колькасцю адзінак, утвораных ад антрапонімаў (16% ад агульнай колькасці назваў населеных пунктаў).

В. П. Лемцюгова сярод айконімаў антрапанімічнага паходжання вылучае дзве падгруппы: 1) айконімы, утвораныя ад уласных асабовых кананічных імён, напрыклад, *Міхалова, Сяргееўшчына, Халімонава*; 2) айконімы, утвораныя ад уласна асабовых назваў апелятыўнага паходжання, напрыклад, *Мядзвёдаўка, Марозава, Куляшы* [1, с. 47]. Паводле меркавання Т. Ю. Васільевай, адантрапанімныя айконімы «складаюць каля 44% ад усіх найменняў населеных пунктаў Беларускага Паазер’я» [2, с. 216–226].

З ліку ўсіх адыменных назваў Лепельшчыны 10% складаюць айконімы, утвораныя ад уласна асабовых назваў апелятыўнага паходжання. З іх значная колькасць назваў населеных пунктаў Лепельшчыны (каля 25% антрапаайконімаў раёна) ўтварылася пры дапамозе фармантаў *-ова, -ава, -іна, -ына: Весялова, Лутчына, Губіна, Марозава, Матырына, Новазаслонава, Тадуліна.* На Віцебшчыне гэты паказчык дасягае 21% [3, с. 166 – 167].

Другая група айконімаў утрымлівае фармант *-еўшчына, -іншчына, -оўшчына: Варапаеўшчына, Казіншчына, Катоўшчына.*

Трэцяя група характарызуецца наяўнасці фарманта *-ічы/-ычы: Караевічы, Новыя Валосавічы, Старыя Валосавічы.*

Антрапонімы, на базе якіх сфарміраваліся назвы населеных пунтаў, адносяцца да розных семантычных груп. Сярод іх вылучаюцца дахрысціянскія імёны, якія адлюстроўваюць асаблівасці характару, паводзін (*Весялова*); час нараджэння (*Марозава*), знешнія прыкметы (*Губіна, Старыя Валосавічы*); антрапонімы, звязаныя з жывёльным і раслінным светам (*Катоўшчына*), і іншыя.

Асаблівую цікавасць выклікаюць айконімы *Завідзічы*, *Домжарыцы*. Паводле Т. Ю. Васільевай, назва *Завідзічы* сфарміравалася на базе nomina personalia і паходзіць «ад рус. завіда ‘зайздрасць‘, ‘зайздрослівы чалавек‘» [2, с. 216–226]. У аснове ж наймення *Домжарыцы* ляжыць старажытнае славянскае двухсастаўнае імя Дамажыр [2, с. 216 – 226].

Калі браць да ўвагі айконімы антрапанімічнага паходжання, утвораныя ад уласных асабовых кананічных імён, то варта згадаць словы В. П. Лемцюговай: «З прыняццем хрысціянства на змену старажытным славянскім імёнам пад уздзеяннем царквы прыйшлі імёны кананізаваных святых, ці кананічныя імёны. У працэсе асваення традыцыйна-царкоўныя формы гэтых імён перажылі рад фанетыка-марфалагічных змен, у выніку чаго ў беларускай мове на аснове іх узнікла шмат новых форм і варыянтаў» [1, с. 49]. «Айконімы, сфарміраваныя на базе праваслаўных і каталіцкіх імёнаў, складаюць 14% ад агульнай колькасці назваў населеных пунктаў Беларускага Паазер’я», – сцвярджае Т. Ю. Васільева [2, с. 216–226]. І гэтае меркаванне цалкам слушнае ў дачыненні тапанімнай сістэмы Лепельскага раёна.

Ад праваслаўных мужчынскіх імёнаў паходзяць наступныя айконімы: *Аўласава* (Аўлас > Уласій), *Антонаўка* (Антон), *Аношкі* (Аношка > Анань), *Макараўшчына* (Макар), *Пахомлевічы* (Пахом > Пахомій), *Сяргееўшчына* (Сяргей), *Халімонава* (Халімон > Філімон), *Цярэшкі* (Цярэшка > Цярэнцій), *Юркоўшчына* (Юрка > Юрый), *Мацюшына* (Мацюх > Мацвей), *Несіна* (Несім > Анісім), *Экімань* (Экімань > Якімій).

Айконімы, якія маюць семантычную сувязь з іменем Міхаіл, сустракаюцца на Лепельшчыне ў дзвюх формах: *Міхалова* і *Мішулькі*. Калі тапонім Мішулькі паказвае на цесную сувязь з праваслаўнай традыцыяй наймення, то айконім *Міхалова* дакладна аднесці да тапанімічнай назвы, якая паходзіць ад кананічнага праваслаўнага імя, нельга. На думку М. В. Бірылы, адзначаная рэгіянальная форма ўзыходзіць да польскага каталіцкага Michał [4], што дазваляе аднесці назвы з асновай Міхал да найменняў, звязаных з каталіцтвам.

Такім чынам, пашыранасць і разнастайнасць антрапааайконімаў Лепельшчыны сведчаць пра антрапацэнтрычны падыход у найменні населеных пунктаў. Фанетычныя змены кананічных імёнаў, якія знайшлі адлюстраванне ў тапонімах, могуць стаць каштоўнай крыніцай для вывучэння асаблівасцей бытавання формаў беларускіх імёнаў на тэрыторыі рэгіёна.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Лемцюгова, В. П. Беларуская айканімія. Лінгвістычны аналіз назваў населеных пунктаў Мінскай вабласці / В. П. Лемцюгова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1970. – 354 с.
2. Васильева, Т. Ю. Реализация персонажного кода культуры в ойконимии Белорусского Поозерья / Т. Ю. Васильева // Ученые записки УО «ВГУ им. П. М. Машерова» : сб. науч.

тр. / УО «ВГУ им. П. М. Машерова» ; редкол.: В. Ю. Боровко [и др.]. – Витебск, 2012. – Т. 13. – С. 216 – 226. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/1311 (дата доступу 31.01.2025).

3. Генкин, В. М. Третий этап формирования топонимии Витебщины / В. М. Генкин // Наука – образованию, производству, экономике : материалы 74-й Региональной научно-практической конференции преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 18 февраля 2022 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: Е. Я. Аршанский (гл. ред.) [и др.]. – Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова, 2022. – С. 166 – 167. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/31644 (дата доступу 31.01.2025).
4. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія 1: Уласныя імёны, імёны-мянушкі, імёны па бацьку, прозвішчы / М. В. Бірыла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1966. – 328 с.